УДК 021.2’’17|/18’’

Л.І. Доўнар, канд. пед. навук, праф.
(БДУКМ, г. Мінск)

# УПАРАДКАВАННЕ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ І ДЗЕЙНАСЦЬ АДУКАЦЫЙНАЙ КАМІСІІ ЯК ПЕРАДУМОВЫ ФАРМІРАВАННЯ НАВУК ПРА КНІГУ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVIII – ПАЧАТКУ XIX СТ.

Росту значэння адукаванасці і вучонасці ў культурнай прасторы Рэчы Паспалітай ў другой палове XVIII ст. спрыяла распаўсюджанне ідэй Асветніцтва, што асабліва адбілася ў галіне правядзення рэформ школьнай адукацыі (1740–1760-я гг.) і ўпарадкаванні бібліятэчнай справы, дзе найбольшых вынікаў дасягнулі езуіты. Ордэн езуітаў у Беларусі, як адзначае аўтарытэтны даследчык гэтай тэмы Т.Б. Блінова, «обладал уникальными книжными сокровищами, увеличивающимися из года в год. Библиотека была предметом постоянной заботы иезуитов, их главным украшением и основным богатством. Каждодневная работа этих библиотек находилась под непосредственным руководством Рима, который заботился о том, чтобы иезуитские библиотеки соответствовали духу времени, потребностям школьного процесса, организованного по образцу европейского, способствовали успешному осуществлению религиозной, научной и педагогической деятельности ордена, распространению грамотности и росту культуры населения Беларуси» [1, с.242].

У пераліку абавязкаў бібліятэкара, або прэфекта бібліятэкі, якія рэгламентаваліся «Статутам» (1763 г.), замацоўвалася праца па складанні каталога на кніжны фонд бібліятэкі (у трох экзэмплярах) [2, с.222]. Пасада прэфекта бібліятэкі звычайна сумяшчалася з пасадай прэфекта школы, што патрабавала дасканалых ведаў ўсяго навучальнага працэса, методыкі выкладання кожнай дысцыпліны, сістэматычнага ўдасканальвання ўласных ведаў і педагагічнага майстэрства настаўнікаў. Асноўнай жа крыніцай папаўнення ведаў служылі новыя кнігі, якімі камплектавалася бібліятэка. Пасада прэфекта бібліятэкі магла таксама сумяшчацца з пасадай прэфекта друкарні, што таксама мела дадатны ўплыў на аператыўнае распаўсюджанне новай інфармацыі, новых ведаў, а на практыцы садзейнічала эфектыўнай дзейнасці бібліятэк, цалкам кніжнай справы і назапашванню практычных кнігазнаўчых ведаў.

Каталогі бібліятэк езуіцкіх калегій у Брэсце, Вільні, Гродна, Навагрудку, Нясвіжы, Мінску, Пінску, Полацку, Слоніме, Слуцку, большасць якіх складзена пасля 1773 г. – гэта важнейшыя дакументы і

для пацвярджэння развіцця кнігазнаўчых ведаў, якія ўтрымліваюць як каштоўныя звесткі аб колькасці кніг і складзе іх фондаў, так метадах іх сістэматызацыі, што неабходны былі для розных спецыялізаваных біблітэк. Да прыкладу, у Полацкім езуіцкім калегіуме існавала шэраг такіх спецыялізаваных бібліятэк: Галоўная бібліятэка, Польская бібліятэка (для прафесараў), студэнцкая бібліятэка, бібліятэкі канцылярыі, магазіна, друкарні, музычнай бурсы, бібліятэка касцёла, вялікая колькасць падручных бібліятэк, агульны фонд якіх у 1820 г. налічваў 122955 кніг [3, с.228]. Сярод вядомых бібліятэкараў-езуітаў, якія распрацоўвалі і ўкаранялі ў практыку бібліятэчна-бібліяграфічныя веды – П.Кжэчэтоўскі, П.Грыньскі, Я.Давідовіч, М Коццэл, К.Багуцкі, А.Карэйва, М.Коўзан, І.Касцялкоўскі, Р.Корсак, А.Трапянскі і інш. [4, с.225].

Значную ролю мела пашырэнне і ўключэнне ў адукацыйны працэс гістарычнай літаратуры [5, с.58; 6, с.44], якой адпаведна папаўняліся фонды бібліятэк навучальных устаноў езуітаў, а з 1750–1751 навуч. года «в Литовской провинции, куда входило большинство коллегий и резиденций ордена в Беларуси, в самых больших школах, существовавших при них, началась практика назначения новой должности – профессора истории» [7, с.235]. Да гэтага гісторыя паралельна ўключалася ў курсы граматыкі і рыторыкі. У эпоху барока езуіты асаблівую ўвагу сталі надаваць літаратуры і філалогіі, была распрацавана складаная «структура філалагічнага, літаратурнага выхавання, якая зрабіла велізарны ўплыў як на школу, так і на літаратуры ўсіх без выключэння ўсходнеславянскіх народаў» [8, с. 201]. Дзякуючы развіццю гістарычных і філалагічных дысцыплін, узрастае цікавасць да іх бібліятэчна-бібліяграфічнага забеспячэння, пацвярджаецца неабходнасць спецыяльных ведаў.

Пасля ліквідацыі езуіцкага ордэна ў Рэчы Паспалітай у адпаведнасці з прынятай 21 ліпеня 1773 г. булай «Dominus as Redemptor noster» папы Клімента XIV пачалося стварэнне дзяржаўнай сістэмы кіравання асветай, якую ўзначаліла Адукацыйная камісія – першае ў Еўропе свецкае міністэрства асветы. Стварэнне Адукацыйнай камісіі Рэчы Паспалітай прывяло да рэфармавання сістэмы адукацыі і рэарганізацыі дзейнасці бібліятэк навучальных устаноў, якія былі ахоплены паўсюднай каталагізацыяй і складаннем спісаў неабходных для навучання кніг [9]. З самага пачатку дзейнасці Адукацыйнай камісіі вялікая ўвага надавалася дыдактычнай ролі бібліятэк у працэсе адукацыі і выхавання [10]. Дасканаленню бібліятэчна-бібліяграфічнага кірунка было прысвечана 19 афіцыйных

дакументаў Адукацыйнай камісіі, а ў 1790–1791 гг. была створана і сетка публічных бібліятэк [11, с.55].

«Выканаўчым органам Адукацыйнай камісіі» стала створанае ў 1775 г. Таварыства вучэбных кніг (дзейнічала да 1793 г.), на асветніцкую ролю якога ў айчыннай гістарыяграфіі звярнуў увагу А.Ф.Самусік [12], адзначыўшы, што рэфармаванне адукацыйнай справы на беларускіх землях у апошняй чвэрці XVIII ст. было цесным чынам звязана з даследаваннем стану вучэбных выданняў і стварэннем (друкам) новых кніг на патрэбы свецкай адукацыі. У гэтым працэсе актыўны ўдзел прынялі Ігнацы Папроцкі [13;14], складальнік новай вучэбнай праграмы, Іахім Храптовіч, які прапанаваў стварыць спіс вучэбных дапаможнікаў і навуковых прац для забеспячэння бібліятэк кожнай школы. Прыступаючы да свайго асноўнага абавязку – падрыхтоўкі вучэбных праграм і выпуску адпаведных падручнікаў, Таварыства найперш занялося выпрацоўкай «агульных падыходаў да якаснага вучэбна-метадычнага забеспячэння навучальнага працэсу» [15, с.46], якія грунтаваліся ў тым ліку на філасофскіх ведах, што пацвярджаецца зваротам членаў Таварыства да класіфікацыі навук Фрэнсіса Бэкана і гэта было пэўным прыкладам развіцця асноў бібліятэчна-бібліяграфічнай думкі. Спецыфіка працэсу мадэрнізацыі школьнай справы Рэчы Паспалітай у азначаны перыяд была звязана з гуманітарнымі дысцыплінамі, якія набывалі грамадска-патрыятычную афарбоўку – выхаванне павагі да народнай культуры і традыцый, вывучэнне мінулага краіны, у чым галоўным прадметам станавілася менавіта гісторыя. Стрыжнем жа ў яе курсе Таварыства адзначала «строго воспитательные орудия, ибо знание само по себе не имеет значения, если оно не ведет к возбуждению добрых инстинктов» [16, с.448]. Усяго Таварыства выдала 29 кніг: 17 падручнікаў (сярод іх «Усеагульная гісторыя» братоў К. і В. Скржэтускіх, 1786 г.), шэсць вучэбных дапаможнікаў (дапаможнік М.Пракаповіча па асновах польскай мовы і літаратуры) і шэсць кніг па методыцы выкладання і абавязках настаўнікаў [17, с.47].

Уздзеянне Таварыства вучэбных кніг на трансфармацыю арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу ў навучальных установах Беларусі ў перыяд Рэчы Паспалітай, а пазней – Расійскай імперыі, урад якой не крануў да пэўнага часу новаўвядзенні Адукацыйнай камісіі [18, с.24; 19, с. 141], садзейнічала далейшай эвалюцыі вучэбных дысцыплін, сярод якіх у 1803 г. была запланавана да выкладання і навука пра кнігу – бібліяграфія. 20 жніўня 1804 г. Аляксандр I зацвердзіў «“Предначертание устроения училищ в округе Императорского Виленского университета”: В распоряжении времени

и часов для наук в училищах Университет сохранил порядок, какой введен был прежней Эдукационной комиссией», то і выкладаліся «науки по уставу Эдукационной комиссии» [20, с.IX]. Выданні Адукацыйнай камісіі і яе Таварыства вучэбнай кнігі «заклалі аснову светапогляду практычна ўсіх прадстаўнікоў тутэйшай польскамоўнай літаратуры», і стымулявалі «актывізацыю навукова-даследчай дзейнасці ў асяроддзі настаўнікаў, якія не толькі распачалі комплекснае даследаванне Беларусі, але і сталі папулярызатарамі прагрэсіўных ідэй эпохі Асветніцтва ў мясцовым грамадстве» [21, с.49]. Пэўныя вынікі адлюстроўваліся і ў заснаванні, мясцовых выданняў, як «Miesiącznik Połocki («Полацкі Месячнік», з 1818 г.), які выдаваўся ў Полацкай акадэмічнай друкарні на карысць краю і навукі: «Znaią oni bowiem iak wielkiey potrzeba nauki i zdatności, aby serce i rozum przystoynie i pożytecznie zabawić, aby zjednać powagę u publiczności, aby ona pisma ich chętnie czytała, i aby to co czyta, było dla niey korzystnem» [22]. Такім чынам, колькасныя і якасныя змены ў галіне бібліятэчна-бібліяграфічнай справы і адукацыі ў другой палове XVIII – пачатку XIX ст. сталі неабходнымі перадумовамі для фарміравання навук пра кнігу.

ЛІТАРАТУРА

1. Блинова, Т. Б. Езуиты в Беларуси. Роль иезуитов в организации образования и просвещения / Т. Б. Блинова. – Гродно : ГрГУ, 2002. – 427 с.
2. Тамсама, с.222.
3. Тамсама, с.228.
4. Тамсама, с.225.
5. Карев, Д. В. Белорусская историография в конце XVIII – начале XX веков : дис. … д-ра ист. наук: 01.00.09 / Д. В. Карев. – Гродно, 1995. – 276 с.
6. Палікоўская, Т.І. Праблема кнігавыдавецкай і бібліятэчнай дзейнасці езуітаў на беларускіх землях у айчыннай гістарыяграфіі / Т.І. Палікоўская // Весці БДПУ. Серыя 2. – 2011. – № 2. – С. 41–45.
7. Блинова, Т. Б. Езуиты в Беларуси…, с.235.
8. Лабынцаў, Ю. Пачатае Скарынам: Беларуская друкаваная літаратура эпохі Рэнесансу / Ю. Лабынцаў ; пер. з рускамоўн. арыг. С. Шупы. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 333 с. : іл.
9. Lelewel, J. Joachima Lelewela Bibljograficznych ksiąg dwoje,... / Joachim Lelewel. – Wilno : J. Zawadzki, 1826. – T. 2. – S. 122–125.

10. Ustawodawstwo szkolne za czasów Komisji Edukacji Narodowej: rozporządzenia, ustawy pedagogoczne i organizacyjne (1773–1793) / J. Lewicki. – Kraków, 1925. – S. 209–330.

11. Саітава, В.І. Бібліяграфазнаўства. Гісторыя : вучэб. дап. / В.І.Саітава, В.Е.Лявончыкаў, Т.В.Кузьмініч ; [пад агул. рэд. Т.В.Кузьмініч]. – Мінск : НББ, 2017. – 248 с.

12. Самусік, А. Ф. Асветніцкая дзейнасць таварыства вучэбных кніг на беларускіх землях у апошняй чвэрці XVIII ст. / А. Ф. Самусік // Весці БДПУ. Серыя 2. – 2011. – № 2. – С. 45–49.

13. Kot, S. Adama Czartoryskiego i Ignacego Potockiego projekty urzadzenia wychowania publicznego / S. Kot // Epoka wielkiej reformy / pod red. S. Lempickiego. – Lwów ; Warszawa : Książnica Polska, 1923. – S. 206-227.

14. Korespondencja Ignacego Potockiego w sprawach edukacyjnych / oprac. B. Michalik. – Wrocław : PAN, 1978. – 255 s.

15. Самусік, А. Ф. Асветніцкая дзейнасць таварыства вучэбных кніг…, с.46.

16. Крыжановский, Е. Учебные заведения в русских областях Польши в период ея разделов / Е. Крыжановский // Киевская старина. – 1882. – № 3.– 443–477.

17. Самусік, А. Ф. Асветніцкая дзейнасць таварыства вучэбных кніг…, с.47.

18. Белецкий, А. В. Исторический обзор деятельности Виленского учебного округа за первый период его существования, 1803–1832 / А.В.Белецкий. – Вильна : тип. А.Г.Сыркина, 1906. – 148 с.

19. Сборник материалов для истории просвещения в России. В 4 т. / под ред. И. П. Корнилова. – СПб : тип. П. П. Сойкина, 1893–1902. – Т. 2. – 1897. – 1160 с.

20. Погодин, А. Виленский учебный округ / А. Погодин. – СПб. : тип. П.П.Сойкина, 1901. – 134 с.

21. Самусік, А. Ф. Асветніцкая дзейнасць таварыства вучэбных кніг…,с. 49.

22. Przemowa // Miesięcznik Połocki. – Połock, 1818. – T. 1. – S. 1.